УДК 94(476):331.108

# КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА ПАРТЫЙНА-ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАЎНІЦТВА БССР У 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей)

*І. А. Пушкін*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання

*У артыкуле прааналізаваны матэрыялы рэгіянальных арганізацый КПСС. На прыкладзе Магілёўскай і Віцебскай абласцей паказана рэальнае становішча ў прамысловасці і стан кадравага патэнцыялу, пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Савецкай Беларусі. Адзначана, што ў 1970-я гг. стабільна не скарачалася, а павялічвалася колькасць растрат і крадзяжоў, у выніку чаго народнай гаспадарцы наносілася вялікая матэрыяльная шкода. Шматлікія факты прыпісак і ашуканства ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм эканамічнага развіцця БССР.*

**Ключавыя словы:** кадравая палітыка, кадры, БССР, прамысловасць, эканамічнае развіццё.

## Уводзіны

Паколькі кадравая палітыка ў СССР традыцыйна была падкантрольная, перш за ўсё, партыйным структурам і адносілася да вобласці "вялікай палітыкі", у савецкай гістарычнай навуцы дадзеная праблема альбо наогул не ўздымалася, альбо даследавалася строга ў рэчышчы "генеральнай лініі" КПСС. Так, роля і значэнне КПСС у справе падрыхтоўкі, фарміравання і кіравання кадрамі ў 1970-х гг. раскрыты ў шэрагу публікацый савецкіх даследчыкаў. Галоўным у іх было тое, што задачы, якія ставіліся перад кадравым складам, былі падпарадкаваны не законам развіцця эканомікі, а фарміраванню новага сацыялістычнага ладу пад кіраўніцтвам КПСС [1; 2; 3; 4]. Склад партыйна-савецкага кіраўніцтва і яго роля ў развіцці эканомікі, сістэма падрыхтоўкі кадраў БССР у пэўныя гістарычныя перыяды закрануты ў абагульняючых працах, якія былі выдадзены ў апошнія дзесяцігоддзі [5; 6; 7; 8]. У сваіх публікацыях даследчыкі не ў поўным аб'ёме асвятлілі пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Савецкай Беларусі.

© Пушкін І. А., 2018

## Асноўная частка

Сучаснай Беларусі неабходны аб'ектыўны аналіз з пункту гледжання гістарычнага вопыту, кадравай палітыкі дзяржаўнай улады, шляхоў фарміравання, зместу і ўдасканалення кадравага патэнцыялу прамысловасці БССР, сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Варта падкрэсліць, што існаванне жорсткага парадку размеркавання кадраў у СССР прыводзіла да таго, што толькі сяброўства ў КПСС адкрывала дарогу спецыялісту для кар'ернага росту. Гэтым партыя спрабавала падтрымліваць кантроль над эканомікай краіны і іншымі сферамі жыцця грамадства.

У адпаведнасці з пастановаю бюро ЦК КПБ "Аб наменклатуры пасад ЦК КПБ" (14.01.1972) была зацверджана аналагічная наменклатура пасад на абласным, гарадскім і раённым узроўнях. Падбор кадраў ажыццяўляўся на аснове так званых "аб'ектывак" і "гутарак" па інстанцыі (ад інспектара да начальніка аддзялення, упраўлення, намесніка міністра, міністра). Так дасягаліся калектыўныя думка і адказнасць наконт кандыдатуры на пасаду. У выніку, калі кандыдат аказваўся не на сваім месцы, ніхто персанальна не нёс за гэта адказнасць, бо была калектыўная думка. У кандыдата найперш вызначалася такая якасць, як адданасць, вернасць справе партыі, а па сутнасці, таму, хто запрашаў на службу. Прафесіяналізм таксама быў патрэбен, але ён адыходзіў на другі план [9, с. 70]. Адметнасцю кадравай палітыкі ў прамысловасці стала тое, што яе вызначала кіраўніцтва КПСС, рэалізоўвала на практыцы кіраўніцтва міністэрстваў СССР Менавіта яно адказвала і кантралявала колькасны склад кадраў у рэспубліцы; устанаўлівала пэўныя пасады і ліквідавала іх; зацвярджала пэўную наменклатуру кадраў, пачынаючы з начальнікаў аддзелаў міністэрстваў, упраўленняў аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іх намеснікаў і заканчваючы намеснікамі міністраў БССР. Рэгіянальным партыйным камітэтам па вертыкалі разам з абласнымі,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

гарадскімі і раённымі выканкамамі на сваім узроўні адводзілася роля падбору кадраў для прамысловасці і абавязковае іх узгадненне з вышэйстаячымі органамі.

Аднак ва ўмовах індустрыяльнай мадэрнізацыі кіраўніцтва партыі, нягледзячы на ўсе спробы і меры, што прымаліся, не здолела захаваць пераважна рабоча-сялянскі склад КПСС, якая паступова ператваралася ў партыю інтэлігенцыі і служачых, што мела вялікае значэнне для далейшага развіцця савецкай дзяржавы. Індустрыяльнае развіццё савецкай дзяржавы, стварэнне новых тэхналогій, агульнае ўскладненне працэсу вытворчасці прывялі да таго, што палітычнай эліце прыйшлося паступіцца некаторымі прынцыпамі ў правядзенні кадравай палітыкі [10; 11].

Аналіз пратаколаў пасяджэнняў абласных партыйных канферэнцый, пленумаў, бюро і сакратарыятаў абласных камітэтаў (АК) КПБ (КПСС) дазваляе нам усебакова прааналізаваць і выявіць негатыўныя аспекты ў змесце і фарміраванні кадравага патэнцыялу БССР на прыкладзе Магілёўскай і Віцебскай абласцей у 1970-я гг. – перыяд буйнага прамысловага развіцця гэтых рэгіёнаў.

Дынамічна і паспяхова развіваліся прамысловасць і рос кадравы патэнцыял Магілёўскай і Віцебскай абласцей у гады дзявятай і дзясятай пяцігодак (1971–1980 гг.). Апераджальнымі тэмпамі развіваліся хімічная, нафтахімічная прамысловасць, машынабудаванне і металаапрацоўка. Павялічваўся аб'ём прамысловай вытворчасці, больш, чым прадугледжвалася пяцігадовымі планамі, выраблялася і рэалізоўвалася прадукцыі. Так, у Магілёўскай вобласці ў першай палове 1970-х гг. было ўведзена ў дзеянне 18 прамысловых прадпрыемстваў, больш за 100 буйных вытворчых аб'ектаў. Выпрацоўка электраэнергіі (1975) у параўнанні з 1970 г. узрасла ў 2,6 разы, вытворчасць электрарухавікоў – на 25,4%, помпаў цэнтрабежных – на 87,2%, сельскагаспадарчых машын – у 2,4 разы, канструкцый і дэталяў зборных жалезабетонных – на 85%, хімічных валокнаў – у 2,8 разы, абутку скуранога – на 64,1%, тавараў культурна-бытавога прызначэння і гаспадарчага ўжытку – на 61,3% і шэраг іншай прадукцыі. Было асвоена 180 новых відаў машын, абсталявання, апаратаў, прыбораў, ўкаранёна 417 механізаваных струменевых і аўтаматычных ліній. Прадукцыйнасць працы павысілася на 46,3% пры заданні на 45,8% [12, арк. 1–2].

У Віцебскай вобласці было пабудавана шмат буйных заводаў: каляровых тэлевізараў, бялкова-вітамінных канцэнтратаў, "Эвістар", "Шкловалакно", керамзітавага жвіру, Віцебскі домабудаўнічы камбінат, вытворчыя аб'яднанні "Нафтан", "Палімір", "Маналіт", "Электравымяральнік", "Оршабудматэрыялы" і інш. У Магілёўскай вобласці з'явіліся такія ўнікальныя прадпрыемствы, як аб'яднанне "Хімвалакно", Магілёўскі камбінат шаўковых тканін, кардонна-рубероййдавы завод у Асіповічах, доследна-прамысловая вытворчасць віскознай сасісачнай абалонкі на заводзе штучнага валакна, новыя аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння, перапрацоўчай, лёгкай і харчовай прамысловасці і інш. Завяршалася будаўніцтва Бабруйскага завода трактарных раскідвальнікаў угнаенняў і завода масавых шын Беларускага шыннага камбіната. Усё гэта ў спалучэнні з канцэнтрацыяй вытворчасці, інтэнсіўнымі метадамі вядзення гаспадаркі дазваляла дасягнуць найвышэйшых у БССР тэмпаў росту аб'ёму вытворчасці [13, арк. 9–14]. У гэтым была заслуга як працоўных, так і кіраўнікоў, якія складалі кадравы патэнцыял рэспублікі. Толькі па выніках восьмай пяцігодкі ў Магілёўскай вобласці 3908 чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР [14, арк. 140].

Побач з поспехамі ў гаспадарчым развіцці выразна прасочваліся сур'ёзныя недахопы ў рабоце шматлікіх прамысловых прадпрыемстваў, а значыцца, у кіраўніцтве імі. Заўважалася схільнасць да састарэлых форм і метадаў працы, няўменне на поўную сілу выкарыстоўваць велізарны патэнцыял інжынернай думкі і дасягненні навукі. Павярхоўны падыход не дазваляў кіруючым колам КПБ і гаспадарнікам знаходзіць аптымальныя рашэнні складаных праблем, ліквідацыі прычын, якія спараджалі недахопы.

На XI пленуме Віцебскага АК КПБ (1972) было адзначана, што, сярод іншага, з-за кадравых праблем у Віцебскай

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вобласці за 10 месяцаў 1972 г. 40 прамысловых прадпрыемстваў (14,7%) не выканалі план па рэалізацыі прадукцыі, 62 прадпрыемствы – па прадукцыйнасці працы, а на 45 прамысловых прадпрыемствах яна значна зменшылася ў параўнанні з 1971 г З 22 прадпрыемстваў, абследаваных за III квартал 1972 г, 10 выпускалі прадукцыю з парушэннем патрабаванняў стандартаў і тэхнічных умоў [15, арк. 16–17].

Гаспадарчыя кіраўнікі, каб атрымаць прэміі і славу, часам станавіліся на шлях ашуканства і падману дзяржавы, завышаючы паказчыкі выканання планавых заданняў. Прычым гэта не адзінкавыя факты. Прыпіскі, ашуканства, крадзеж дзяржаўных сродкаў мелі месца на прадпрыемствах транспарту, гандлю і побыту, у будаўнічых арганізацыях, калгасах і саўгасах, прамысловых прадпрыемствах.

Асабліва шмат было буйных крадзяжоў і злоўжыванняў у спажывецкай кааперацыі БССР. За 1969–1972 гг. было зарэгістравана 343 выпадкі буйных растрат і крадзяжоў таварна-матэрыяльных каштоўнасцей на суму 465,5 тыс. руб. Толькі ў 1971 г. ў Магілёўскай вобласці ў ходзе фінансава-гаспадарчых рэвізій і крымінальных следстваў выяўлена 178 розных адказных асоб, якія ўдзельнічалі ў крадзяжы дзяржаўнай і грамадскай уласнасці. За дапушчаныя злоўжыванні было прыцягнута да адказнасці 146 работнікаў спажыўкааперацыі. У першай палове 1972 г. было знята з пасадаў 14 кіруючых работнікаў, у тым ліку старшыня райспажыўсаюза [16, арк. 194–195].

Нездавальняюча забяспечвалася захаванасць сацыялістычнай уласнасцю ў Крычаўскім, Хоцімскім, Клімавіцкім, Краснапольскім, Бялыніцкім, Чавускім, Горацкім, Слаўгарадскім райспажыўсаюзах, Клічаўскім і Чэрыкаўскім райпа. Толькі за 1970–1972 гг. за незабеспячэнне даручанага ўчастка работы, дапушчаныя злоўжыванні і іншыя недахопы ў працы было вызвалена ад займаемых пасадаў 6 старшынь праўленняў райспажыўсаюзаў, 10 намеснікаў старшынь праўленняў па гандлі і 12 па кадрах, 12 дырэктараў аптовых баз, 12 дырэктараў райнарыхкантор, 11 галоўных бухгалтараў і 547 матэрыяльна адказных работнікаў [17, арк. 3].

Факты злоўжыванняў і хабарніцтва былі выкрыты ў той час і ў сферы будаўніцтва, сістэме жыллёвых будаўнічых кааператываў, на прадпрыемствах мясной і малочнай прамысловасці.

Калектыўнымі крадзяжамі дзяржаўных сродкаў шляхам складання фіктыўных працоўных пагадненняў і іншых махінацый займаліся ў вытворчым аб'яднанні "Бабруйсксельмаш". У ліку ініцыятараў былі намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання, начальнікі планавага і вытворчага аддзелаў, выконваючы абавязкі галоўнага бухгалтара (усе члены КПСС). За два гады імі была скрадзена каля 3 тыс. руб. [13, арк. 44].

На Бабруйскім малочным заводзе было выкрадзена каштоўнасцей больш чым на 100 тыс. руб.

Доўгі час у будаўнічым упраўленні № 58 трэста "Лаўсанбуд" (Магілёў) дзейнічала група раскрадальнікаў. Яна займалася крадзяжом будаўнічых матэрыялаў, якія затым прадаваліся прыватным асобам, а атрыманыя грошы прысвойваліся. Адным з актыўных удзельнікаў групы раскрадальнікаў з'яўляўся сам начальнік гэтага ўпраўлення [16, арк. 183, 200].

Не было належнага патрабавання і высокай прынцыповасці ў адзнацы дзейнасці партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў. Часта замена работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў, што не давала жаданага выніку.

Дырэктар Магілёўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў з мэтай атрымання прэмій і іншага матэрыяльнага ўзнагароджання займаўся прыпіскамі і ашуканствам. Ленінскі райкам партыі прыцягнуў яго да партыйнай адказнасці, абласное ўпраўленне мясцовай прамысловасці вызваліла яго ад працы "па ўласным жаданні". Але ўпраўленне бытавога абслугоўвання тут жа прызначае яго дырэктарам Магілёўскага аб'яднання па хімчыстцы і лазнева-пральнаму абслугоўванню.

У трэсце "Магілёўсельбуд" у свой час за прыпіскі, крадзеж будаўнічых матэрыялаў і іншыя злоўжыванні быў зняты з працы начальнік ПМК-58. Вельмі хутка ён быў прызначаны начальнікам вытворчага аддзела, а потым і галоўным інжынерам ПМК-44 [16, арк. 181, 185–186, 195, 202].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Намеснік начальніка ўпраўлення мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці быў вызвалены ад пасады за злоўжыванне службовым становішчам, але адразу быў прызначаны дырэктарам хімзавода. Затым намеснікам генеральнага дырэктара ВА "Хімпласт", у 1972 г Чыгуначным РК КПБ г Віцебска быў рэкамендаваны на пасаду дырэктара завода жалезабетонных вырабаў трэста "Віцебскаблсельбуд". А ў лістападзе 1972 г вызвалены ад пасады, бо не справіўся з працаю [15, арк. 14–15].

Доўгі час у г. Магілёве ставілі ў прыклад як лепшага кіраўніка дырэктара завода тэхналагічнага абсталявання або тады яшчэ ложкавага завода. А потым высветлілася, што на заводзе выпускалася няякасная прадукцыя, квітнела ашуканства, незаконна выдаваліся грашовыя прэміі [16, арк. 181–186].

Былі факты прыпісак і адпаведна незаконных выплат прэмій на Магілёўскім мясакамбінаце і ліфтабудаўнічым заводзе. Прычым на апошнім у справаздачах аб выкананні бягучых планаў за 1971 г. і 1978 г. (дырэктар быў той жа). Нягледзячы на гэта, завод рэгулярна значыўся на абласной Дошцы гонару [18, арк. 43–44; 19, арк. 68–75]. Кіраўніцтва завода на працягу двух год (1977–1978) уключала ў выкананне плана рэалізацыі не адгружаную прадукцыю. За гэта было незаконна выплачана 120 тыс. руб. прэмій (амаль тысячу атрымаў дырэктар завода, а сакратар партыйнага камітэта завода – 1103 руб.) [20, арк. 57].

За 1970–1971 гг. у Магілёўскай вобласці было прыцягнута да партыйнай адказнасці каля 120 сакратароў пярвічных партарганізацый. Асабліва дрэнна ішла справа ў Магілёўскай, Чэрыкаўскай і Чавускай раённых партарганізацыях [16, арк. 175]. За 1974–1975 гг. 61 кіраўнік асноўнай абласной наменклатуры былі вызвалены ад займаемай пасады, бо не забяспечылі працу або скампраметавалі сябе [13, арк. 54–56].

Сур'ёзныя недахопы ў падборы, расстаноўцы і выхаванні кадраў дапускаў Бабруйскі гаркам КПБ. За тры гады ў Бабруйску было заменена 63 работнікі, якія ўваходзілі ў наменклатуру гаркама. За гэты ж час 30 кіруючых работнікаў было прыцягнута да партыйнай адказнасці.

За 1970–1971 гг. за ганебныя паводзіны і розныя правіннасці былі вызвалены ад працы старшыні райвыканкамаў: Краснапольскага, Клічаўскага, Кіраўскага. За праяўленую нясціпласць пры вырашэнні жыллёва-кватэрных пытанняў былі пакараныя ў рознай меры старшыні Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Хоцімскага райвыканкамаў. Замест таго каб наводзіць парадак у раёнах, папярэджваць разнастайныя парушэнні, яны самі паказвалі дрэнны прыклад [16, арк. 184, 176–177]. Інспектарскай групай ЦК КПБ былі выяўлены факты неабгрунтаванай замены кватэр адказнымі работнікамі Магілёўскага аблвыканкама і абкама КПБ [21, арк. 55–58].

Падводзячы вынікі працы бюро Магілёўскага АК КПБ, сакратар абкама В. Прышчэпчык адзначыў, што за 1976–1977 гг. на пленумах і бюро абкама, гаркамаў і райкамаў КПБ разгледжана больш 230 пытанняў, якія тычыліся паляпшэння працы кадраў: "*Ошибки в подборе, расстановке и воспитании кадров – одна из главных причин довольно большой сменяемости работников, отставания ряда предприятий промышленности, строительных организаций, колхозов и совхозов. За два года освобождено от занимаемых должностей 80 работников номенклатуры обкома КПБ, которые утратили авторитет недостойным поведением и по своим деловым и моральным качествам не могли больше оставаться на ответственных должностях <…> Много фактов, когда отдельные "горе-руководители" говорили одно, провозглашали с трибуны о высоких моральных качествах, а делали совсем другое, по уши влезали в грязь стяжательства, теряли совесть, запускали руку в государственный карман. В работе с кадрами у нас еще было много формализма*" [18, арк. 127–129].

За 1971–1975 гг. органамі народнага кантролю за прыпіскі і падман дзяржавы, праявы месніцтва ў Магілёўскай вобласці былі прыцягнуты да адказнасці 644 пасадавыя асобы [12, арк. 10, 14–15], што складала 4,47% наменклатуры Магілёўскага абкама, гаркамаў і райкамаў КПБ вобласці, у склад якой ўваходзілі 14393 чалавекі [16, арк. 171].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

За 1976–1978 гг. змянілася 47 загадчыкаў аддзелаў і 135 інструктараў гарадскіх і раённых камітэтаў партыі, і толькі 48% з ліку змяніўшыхся работнікаў гаркамаў і райкамаў былі вылучаны на больш адказную працу. Былі вымушаны (менавіта так адзначалася на XX Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі) вызваліць ад займаемых пасад 110 чал. наменклатуры АК КПБ. За розныя парушэнні статута КПСС на 763 кіруючых работнікаў былі накладзены строгія партыйныя спагнанні. Да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 2,5 тыс. раскрадальнікаў народнага дабра, больш 40 тыс. чалавек трапілі ў медвыцвярэзнік [20, арк. 41, 57].

У Віцебскай вобласці за 1975–1980 гг. больш за 100 кіраўнікоў за розныя злоўжыванні атрымалі спагнанні па лініі КПСС, 27 былі вызвалены ад займаемых пасад. У наступны перыяд сітуацыя ў вобласці толькі пагаршалася. Так, толькі за 1981 г. былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 138 кіраўнікоў [22, арк. 86].

Бюро ЦК КПБ у сваёй пастанове “Аб працы Магілёўскага абкама КПБ з кадрамі ў святле XXV з’езда КПСС” (1979) адзначыла, што праца з кадрамі не стала на той час галоўнай у дзейнасці шэрагу партыйных камітэтаў, стыль і метады не адпавядалі ўзрослым задачам гаспадарчага і культурнага будаўніцтва [23, арк. 9]. Абласное кіраўніцтва не пазбавілася ад фармальна-бюракратычнага стылю ў працы. Значную частку часу гублялі на правядзенне пасяджэнняў і нарад, на разгляд і падрыхтоўку розных дакументаў.

## Заключэнне

Такім чынам, аналіз матэрыялаў двух абласных камітэтаў кампартыі дазваляе выявіць рэальнае становішча ў прамысловасці і стане кадравага патэнцыялу, пралікі і недахопы ў кадравай палітыцы. Варта падкрэсліць, што ў іх трапілі толькі тыя прыклады, якія не магчыма было схаваць ад грамадскасці. Шматлікія факты па ідэалагічных прычынах замоўчваліся. Неабходна адзначыць, што ў 1970-я гг. прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэння, а да павялічэння колькасці растрат і крадзяжоў, у выніку чаго народнай гаспадарцы наносіўся вялікі матэрыяльны ўрон. За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва так і не вырашыла, сярод іншых, праблему ашуканства і крадзяжоў нават у асяродку кіруючых кадраў. У шэрагу гарадоў і раёнаў не заўважаліся факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраметавалі сябе, і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіруючыя пасады. Усё гэта сведчыць пра неэфектыўнасць кадравай палітыкі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР. Шматлікія факты прыпісак і ашуканства ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм гаспадарчага развіцця БССР.

## *СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ*


1. Возрастание руководящей роли КПСС в строительстве социализма и коммунизма / редкол.: П. А. Родионов [и др.]. – Москва : Политиздат, 1979. – 296 с.
2. ***Петровичев, Н. А.*** Возрастание руководящей роли КПСС и вопросы организационно-политической работы / Н. А. Петровичев. – Москва : Политиздат, 1982. – 255 с.
3. ***Пронин, И. И.*** Руководящие кадры: подбор, расстановка и воспитание / И. И. Пронин. – Москва : Мысль, 1981. – 224 с.
4. ***Разумов, Е. З.*** Проблемы кадровой политики КПСС / Е. З. Разумов. – Москва : Политиздат, 1983. – 192 с.
5. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Сучасная школа, Экаперспектыва, 2011. – 728 с.
6. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.
7. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац.акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус.навука, 2008. – 615 с.
8. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Ч. 2 / А. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. ; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.
9. ***Барвінок, К. І.*** Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. / К. І. Барвінок, І. А. Саракавік // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2005. – № 4. – С. 69–75.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

10. ***Федоров, А. В.*** Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. / А. В. Федоров // Сборник трудов молодых ученых МПИ ФСБ России. Вып. 3. – Москва, 2004. – С. 12–19.
11. ***Федоров, А. В.*** Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / А. В. Федоров. – Москва, 2005. – 16 с.
12. Доклад “Основные итоги развития народного хозяйства Могилевской области за 1971–1975 годы” // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). – Фонд 9. Воп. 155. Спр. 2.
13. Отчетный доклад Могилевского обкома КПБ XIX областной партийной конференции (23–24.12.1975 г.) // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 155. Спр. 1.
14. Постановление пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМАг. – Фонд 9. Воп. 149. Спр. 3. Арк. 140.
15. Протокол XI пленума Витебского областного комитета КПБ 28–29.11.1972 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Фонд 1-п. Воп. 124. Спр. 8.
16. Протокол № 8 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 04.07.1972 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 149. Спр. 3.
17. Протокол № 33 заседания бюро Могилевского обкома КПБ от 6.04.1973 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 151. Спр. 15.
18. Протокол № 11 заседания пленума Могилёвского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 159. Спр. 109.
19. Постановление бюро Могилевского обкома КПБ, исполнительного комитета областного Совета депутатов и президиума областного совета профсоюзов от 29.10.1974 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 153. Спр. 40.
20. Протокол XX Могилевской областной партийной конференции от 26.01.1979 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 162. Спр. 2.
21. Протокол № 7 заседания секретариата Могилевского обкома КПБ от 6.05.1975 г. // ДАГАМаг. – Фонд 9. Воп. 155. Спр. 48.
22. Протокол VII пленума Витебского областного комитета КПБ. 02.09.1982 г. // ДАВц. – Фонд 1-п. Воп. 154. Спр. 11.
23. Протокол № 2 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 11.04.1979 г. // ДАГАМАг. – Фонд 9. Воп. 162. Спр. 12.

Паступіў у рэдакцыю 26.02.2018 г.
Кантакты: ihar.pushkin.st@gmail.com
(Пушкін Ігар Аляксандравіч)

**Pushkin I. PERSONNEL POLICY OF THE PARTY AND STATE LEADERSHIP OF THE BSSR IN THE 1970s (in Vitebsk and Mogilev regions).**

*The author analyzes the materials of the regional organizations of the CPSU. The situation in industry and the state of the personnel potential, errors and shortcomings in the personnel policy of the party and state leaders of the Soviet Belarus are displayed regarding Mogilev and Vitebsk regions. The number of cases of embezzlement and peculation in the 1970s increased rather than decreased, which resulted in considerable material damage to the national economy. The numerous facts of distortions and frauds cast doubt on the reliability of the reported figures on the implementation of plans and programs for the economic development of the BSSR.*

**Keywords:** personnel policy, personnel, BSSR, industry, economic development.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова